**Сяргей НОВІКАЎ**

# Халакост — Шоа — Катастрофа: сучаснае навуковае асэнсаванне ў Беларусі

**27 студзеня 2021 года ўжо 15 год адзначаецца Міжнародны дзень памяці ахвяр Халакосту. 22 чэрвеня 2020 года споўнілася пяць гадоў з моманту афіцыйнага адкрыцця першай чаргі будаўніцтва Мемарыяльнага комплексу "Трасцянец". За гэты час адбылося ўвядзенне ў строй яго другой чаргі ва ўрочышчы Благаўшчына, аднак незавершанасць будаўнічых і архітэктурных работ, розныя канцэпцыі і падыходы пад час мемарыялізацыі трагічнай гісторыі Халакосту паставілі прынцыпова важныя пытанні інфармацыйнага, педагагічнага і экскурсійнага кшталту ў кантэксце рэгіянальнага, еўрапейскага і сусветнага вопыту.**



**НОВІКАЎ Сяргей Яўгеньевіч.**

*Загадчык кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1954 г. у в. Радзіца Крупскага раёна Мінскай вобласці, у 1980 г. закончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М.Горкага. Займаецца даследаваннем эканамічнай гісторыі Беларусі перыяду нацысцкай акупацыі, праблем германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны і крыніцазнаўства. Аўтар манаграфій "Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941—1944 гг.: агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гадоў" (Мн., 2002), "Беларусь у кантэксце германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны" (Мн., 2004), "Беларусь улетку 1941 года: новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў" (Мн., 2015, 2-е выд.), больш за 330 навуковых публікацый. З'яўляецца сурэдактарам навуковых зборнікаў "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць" (Вып. 1—18, Мн., 2002—2020).*

Патрэбу звярнуцца да навуковага асэнсавання гісторыі нацысцкага генацыду яўрэйскага насельніцтва ў Беларусі ў 1941—1944 гг. выклікала важная навуковая падзея сусветнага значэння, што восенню 2019 г. упершыню адбылася на еўрапейскім кантыненце — Міждысцыплінарны Кангрэс па даследаванні Халакосту. У другім нумары за 2020 г. шырока вядомага ў Еўропе навуковага штоквартальніка Інстытута найноўшай гісторыі ў Мюнхене ("Vierteljahrshefte für Zeitgeschichte") была апублікаваная кароткая навуковая справаздача аб выніках працы кангрэса. Кіраўнік Цэнтра па даследаванні Халакосту згаданага інстытута прафесар Франк Байёр і яго намесніца доктар Андрэа Лёў не толькі далі агульную інфармацыю аб працы кангрэса, але і ўзгадалі яго гісторыю. Яны паведамілі, што гэтая канферэнцыя ладзіцца ў Паўночнай Амерыцы пачынаючы з 1989 г. раз у два гады. На сёння гэта сусветна прызнаны транснацыянальны форум па даследаванні гісторыі Халакосту. Аўтары адзначаюць, што ўпершыню даследчыкі гэтай тэмы з усяго свету сустрэліся ў горадзе Сан-Хасэ (ЗША) яшчэ ў 1978 г. З таго часу тэма масавага знішчэння еўрапейскіх яўрэяў стала адной з галоўных тэм міжнародных даследаванняў і навуковых сустрэч. Аўтары адзначаюць невыпадковасць лідарства Злучаных Штатах Амерыкі ў арганізацыі і правядзенні кангрэса, паколькі менавіта ў гэтай краіне тэма Халакоста была прынята ў акадэмічных і грамадскіх колах, а з цягам часу стала парадыгмай глабальнай культуры памяці.

У Германіі кангрэс адбыўся ўпершыню, нягледзячы на тое, што з пачатку 1990-х гг. на еўрапейскім кантыненце назіраўся значны ўздым даследаванняў па розных аспектах гісторыі Халакосту. Форум праводзіўся 4—7 лістапада 2019 г. у Мюнхене пры падтрымцы шматлікіх інстытуцый, у тым ліку: Цэнтра па даследаванні Халакосту Інстытута

найноўшай гісторыі ў Мюнхене, Федэральнага цэнтра палітычнай адукацыі, Фонду па вывучэнні Халакосту ў Паўночна-Заходнім універсітэце ЗША, а таксама ўніверсітэта Людвіга-Максіміліяна ў Мюнхене. Праца кангрэса была арганізавана на 36 панэльных пасяджэннях і ў 11 тэматычных семінарах, што сведчыла аб правядзенні аднаго з самых вялікіх профільных кангрэсаў, якія дагэтуль праходзілі не толькі ў Германіі, але і ўва ўсёй Еўропе па гэтай тэматыцы. Таму не дзіўна, што для ўдзелу ў ім было пададзена звыш 700 заявак, з якіх адабраныя да ўдзелу толькі 200.

Аўтары адзначаюць, што, нягледзячы на захаванне прынятых раней традыцыйных міждысцыплінарных падыходаў, на мюнхенскім кангрэсе ўпершыню адбылося такое шырокае абмеркаванне вынікаў навуковых даследаванняў, удалося вызначыць новыя тэндэнцыі ў вывучэнні Халакосту, выявіць інфармацыйныя, педагагічныя і іншыя магчымасці па ўзбагачэнні наратыву пра яго. Такі падыход стаў галоўным патрабаваннем у справе ўсебаковага даследавання нацыянальнага гістарычнага наратыву ў Германіі і Еўропе. Таму не дзіўна, што ў часе кангрэса ў значна меншай ступені праяўлялася тэндэнцыя да "ўніверсалізацыі Халакосту", замацаваная фактам яго "амерыканізацыі"[1]. Адной з галоўных прычын такога падыходу, як адзначаюць аўтары, з'яўляецца наяўнасць вялікай колькасці аўтэнтычных месцаў нацысцкага панавання і генацыду ў Еўропе, прычым як рэгіянальнага, так і лакальнага ўзроўню, дзе на цяперашні час створаны шматлікія мемарыяльныя комплексы, якія вядуць вялікую асветніцкую працу з наведвальнікамі розных катэгорый. Таму галоўная тэматыка выступленняў на мюнхенскім кангрэсе вызначалася не філасофскімі ці тэалагічнымі, не літаратурнымі ці кінематаграфічнымі вобразамі, а ў першую чаргу — эмпірычнымі фактамі і даследчымі вынікамі па гісторыі Халакосту ў Еўропе. Аўтары засяроджваюцца на некалькіх праблемных пытаннях, якія актыўна абмяркоўваліся ўдзельнікамі сустрэчы, а таксама знаёмяць чытача з галоўнымі тэндэнцыямі, вылучанымі ў Мюнхене ў якасці дамінуючых на бліжэйшую перспектыву. На наш погляд, знаёмства з матэрыяламі кангрэса мае надзвычай важнае значэнне для беларускай гістарычнай навукі і шырокай грамадскасці.

## Ад цэнтра на перыферыю

Такую тэндэнцыю вызначаюць нямецкія аўтары па выніках аналізу матэрыялаў, прадстаўленых на кангрэсе. На прыкладзе ўводнага даклада, з якім выступала амерыканская даследчыца Наталі Алексіўн з прыватнага каледжа Тора ў Нью-Йорку, акцэнт быў зроблены на пытанні аб цяжкасцях выбару яўрэйскай ахвярай нацысцкага пераследу паміж сямейнымі і сацыяльнымі стратэгіямі выжывання. Аўтары падкрэсліваюць важнасць захавання дзвюх важных тэндэнцый пры даследаванні падобных пытанняў: з аднаго боку, дэталізаванага паказу індывідуальных гісторый яўрэяў у час іх пераследу, а з іншага — разгляду мікрагісторыі Халакосту праз канкрэтныя факты падзей рэгіянальнага і лакальнага ўзроўняў. У гэтым выпадку ў фокусе такіх даследаванняў павінны знаходзіцца Цэнтральная і Усходняя Еўропа, ці тыя рэгіёны, у якіх Халакост меў гістарычнае месца і адкуль бяруць паходжанне гісторыі большасці яго ахвяр[2].

Аўтары згадваюць, што ўпершыню ў Германіі даследчыкі Халакосту сабраліся на навуковую канферэнцыю ў Штутгарце ў 1984 г., калі падобныя пытанні не стаялі ў цэнтры тагачасных нямецкіх даследаванняў. Галоўнае месца на той час займалі пытанні гісторыі Халакосту ў цэнтры, а не на перыферыі. Адкуль узнік і якія этапы прайшоў *"генезіс канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання"*. Калі пачаліся забойствы праз непасрэднае ўздзеянне *"загадаў фюрэра"* і дзейнасць полікратычных структур пануючага рэжыму? Як адзначаюць аўтары, характэрна, што на кангрэсе ў Мюнхене на гэтую тэму не прагучала ніводнага даклада, не было зроблена ніводнага паведамлення. Наадварот, канстатаваўся факт узрастаючай "еўрапеізацыі" Халакосту, паколькі забойцы яўрэйскага насельніцтва заўсёды знаходзілі сабе памочнікаў на месцах. У якасці прыкладу польскі і канадскі гісторык Ян Грабоўскі з універсітэта Атавы прывёў факты злачыннай кааперацыі паміж германскай крымінальнай паліцыяй і іх польскімі памагатымі ў Генеральным губернатарстве. Сярод саўдзельнікаў у забойстве яўрэяў на месцах у акупаванай Польшчы называліся бургамістры, старасты і даносчыкі. Апроч іх дакладчык згадваў і тых палякаў, хто, з аднаго боку, рызыкаваў уласным жыццём дзеля выратавання ахвяр нацысцкага пераследу, а з іншага — ператвараўся ў непасрэднага памагатага.

Аб удзеле мясцовых калабарантаў у Халакосце распавядаў і прафесар Польскай акадэміі навук А.Энгелькінг. Яго даклад пабудаваны на ўспамінах беларусаў Палесся аб знішчэнні яўрэяў і ўдзеле ў гэтым мясцовых жыхароў. У выступленні адзначалася, што ў афіцыйным гістарычным наратыве практычна не гаворыцца пра ўдзел мясцовай калабарацыі ў нацысцкіх злачынствах, тады як у пасляваенных успамінах жыхары беларускіх вёсак згадваюць у першую чаргу пра "сваіх здраднікаў", паколькі нямецкія карнікі выконвалі свае задачы і зніжалі назаўсёды, а "сваіх" мясцовыя жыхары запаміналі на ўсё жыццё. У выніку Ф.Байер і А.Лёў прыходзяць да высновы, што перспектыва змены парадыгмы з цэнтра на перыферыю і мікрагісторыю па даследаванні гісторыі Халакосту ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе дае добрую магчымасць для выяўлення новых ведаў пра мясцовых злачынцаў, а таксама іх памагатых на лакальным узроўні. У той жа час нельга канцэнтравацца выключна на гэтых аспектах, не праводзячы аналіз з улікам наяўнасці ўсяго комплексу ведаў па гісторыі Халакосту. Робіцца выснова, што ў сітуацыі гістарычнай "еўрапеізацыі" Халакосту нельга пакідаць па-за ўвагай тыя рашэнні, якія прымала нацысцкая Германія і яе кіраўніцтва

ў дачыненні да яўрэяў усёй Еўропы ўвогуле і на месцах у прыватнасці[3].

Выкарыстоўваючы згаданы вышэй падыход, разгледзім дасягненні сучаснай беларускай гістарыяграфіі гісторыі Халакосту 1941—1944 гг. Як адзначае вядучы беларускі спецыяліст па ваеннай гістарыяграфіі У.В.Здановіч у сваім доктарскім даследаванні "Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941—1945 гг.) у адлюстраванні айчыннай гістарыяграфіі", у постсавецкай гістарычнай навуцы Беларусі знайшла дэталёвае асвятленне палітыка нацысцкага генацыду ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва[4]. Пры гэтым ён канстатуе: *"праблема нацысцкага генацыду ці Халакосту ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва Беларусі адлюстравана і ў манаграфічнай, і ў навукова-папулярнай літаратуры"*[5]. Аднак, называючы шматлікія працы, пабудаваныя на даследаванні лакальных аспектаў нацысцкага генацыду ў Беларусі, пакідае іх без навуковага аналізу, не разглядае той навуковы набытак, які быў створаны ў 2000-я гг. беларускімі гісторыкамі Р.Вінніцай, М.Саваняка, А.Корсак, Я.Розенблатам, пры гэтым не вылучае ў якасці самастойнага гэты важны накірунак беларускай гістарычнай навукі, адпаведна не паказвае з'яўленне важнай тэндэнцыі, скіраванай на навуковае даследаванне пытанняў рэгіянальнай і лакальнай гісторыі Халакосту ў Беларусі[6]. Між тым у згаданых працах яшчэ не знайшлі ўсебаковага адлюстравання даследчыцкія падыходы, пра якія вялася размова на кангрэсе ў Мюнхене. Не даюць магчымасці раскрыць асобныя аспекты гісторыі Халакосту на лакальным узроўні і некаторыя працы, прысвечаныя трагедыі яўрэйскага насельніцтва ў Беларусі ў 1941—1944 гг.[7]. Не вырашаюць гэтай задачы і найноўшыя фундаментальныя акадэмічныя працы[8].

Гэта азначае, што сёння беларуская гістарыяграфія мае пэўныя напрацоўкі, якія паказваюць асаблівасці масавага знішчэння яўрэйскага насельніцтва Беларусі, раскрываюць іх не толькі на рэгіянальным, але і на лакальным узроўні. Аднак абагуленай работы, якая б давала комплексныя ўяўленні ў дачыненні да ўсёй тэрыторыі Беларусі, вылучаючы пры гэтым як агульныя рысы, так і адметныя прыкметы, аналізуючы Халакост не толькі ў кантэксце нацысцкага вынішчэння беларускага яўрэйскага насельніцтва, але і дэпартаваных з Аўстрыі, Германіі і Чэхіі яўрэяў, на сённяшні дзень пакуль не створана. Можна сцвярджаць, што на гэты час няма сістэмнага даследавання гісторыі генацыду яўрэйскага насельніцтва ў Беларусі.

Таксама звернем увагу на важны метадалагічны момант, звязаны з вызначэннем сутнасці нацысцкага генацыду яўрэйскага насельніцтва на беларускай зямлі. На кангрэсе ў Мюнхене гэтыя пытанні былі ў фокусе дыскусіі, прысвечанай вынікам даследавання гісторыі Халакосту, выкарыстанню гэтай тэмы ў сферы адукацыі і выхавання на прыкладзе дзеючых музейных і мемарыяльных цэнтраў, "новым паваротам" у публічнай памяці і палітыцы. Дыскусія праводзілася пад кіраўніцтвам прафесара ўніверсітэта ў Вашынгтоне К.Р.Браўнінга, аўтара сусветна вядомых даследаванняў нацысцкага генацыду яўрэяў у Польшчы. Вядома, што ў сучаснай сусветнай гістарыяграфіі шырока выкарыстоўваюцца розныя тэрміны гэтай гістарычнай з'явы, якая мела месца ў выніку правядзення гітлераўскай Германіяй палітыкі па *"канчатковым вырашэнні яўрэйскага пытання"*, дзе галоўным метадам з'яўлялася фізічная ліквідацыя ці знішчэнне яўрэйскага насельніцтва на аснове расавай тэорыі. Храналагічна факт знішчэння еўрапейскіх яўрэяў замацаваны шматлікімі дакументамі, дзе размова ідзе пра іх забойства з выкарыстаннем для гэтага самых розных метадаў.

Але нямецкія дакументальныя матэрыялы сведчаць, што сам тэрмін *"Халакост"* у іх не згадваецца, таму разглядаецца сучаснымі вядучымі нямецкімі даследчыкамі ў большай ступені як "метафара"[9]. Больш за тое, у англамоўнай літаратуры гэты тэрмін ужываецца ў розных канатацыях як *"Халакост"* (Holocaust); у франкамоўнай літаратуры як *"Шоа"* (Shoa = катастрофа), у сучаснай ізраільскай гістарыяграфіі ўжываюцца дзве назвы *"Шоа"* і *"Катастрофа"*. Як вядома, тэрмін *"Халакост"* быў упершыню выкарыстаны былым вязнем нацысцкіх канцлагераў Аўшвіц і Бухенвальд, пісьменнікам, лаўрэатам Нобелеўскай прэміі Элі Візелем у якасці метафары ў пачатку 1960-х гг. для таго, каб у вобразнай форме сімвалічна перадаць спальванне цэлага народа ў крэматорыях нацысцкіх лагераў смерці[10]. Найбольшае распаўсюджанне ў свеце, у тым ліку на постсавецкай прасторы, атрымаў тэрмін *"Халакост"*. Як тлумачыць расійскі гісторык І.А.Альтман, гэты тэрмін паходзіць ад старажытнаяўрэйскага "Голокаустас" — "усеспаленне"; "знічшэнне агнём"; "ахвярапрынашэнне"[11]. У сучаснай германскай гістарыяграфіі не ідзе размова пра адмаўленне гэтай з'явы, а толькі пра навуковы падыход у дачыненні да гісторыі падзей, звязаных з масавым знішчэннем еўрапейскіх яўрэяў з боку нацысцкай Германіі і яе памагатых.

Найбольш грунтоўнай працай у рэчышчы пастаўленай праблемы стала манаграфія прафесара К.Герлаха "Забойства еўрапейскіх яўрэяў: прычыны, падзеі, маштабы", якая спачатку пабачыла свет на англійскай, а потым на нямецкай мове[12]. Заўважым, што ў першай частцы яна сугучная доктарскай дысертацыі "Знішчэнне еўрапейскіх яўрэяў", падрыхтаванай Р.Хільбергам у сярэдзіне 1950-х гг., а выдадзенай асобнай манаграфіяй у 1961 г.[13]. Нямецкі гісторык звяртае ўвагу на тэрміналогію, адзначаючы важнасць яе правільнага выкарыстання ў гістарычных працах. К.Герлах не выкарыстоўвае тэрміны "Халакост" і "Шоа", каб не рабіць недакладных ці памылковых гістарычных ацэнак і навуковых высноў. На яго думку, абодва тэрміны не даюць магчымасці для адэкватнага аналізу і гістарычнай ацэнкі тых трагічных падзей. Тэрмін "Халакост" мае рэлігійную канатацыю, у фокусе якой ляжыць прынясенне ахвяры агню, тады як у гісторыі за гэтай па-

дзеяй сталі розныя формы гвалту, які выкарыстоўваў нацысцкі рэжым у дачыненні да яўрэйскіх ахвяр. Дэфініцыя *"Шоа"* нясе ў сабе адценне прыроднай катастрофы і таму можа падавацца ў тэалагічным кантэксце. У выніку адбываецца падмена паняццяў, звязаных як быццам бы з адной гістарычнай падзеяй, тады як гісторыя знішчэння яўрэйскага насельніцтва была даволі адметным фактам са сваёй дакладнай практыкай. У гэтым жа кантэксце К.Герлах разглядае назву *"Асвенцым"*. Ён заўважае, што калі ўжываць яе ў дачыненні да факта знішчэння еўрапейскіх яўрэяў, то гэта будзе памылкова, паколькі працэс пераследу і знішчэння яўрэяў на прыкладзе толькі гэтага аднаго месца паказвае існаванне выключна цэнтралізаванай і тэхналагічнай формы забойстваў, у той час як у розных месцах гэта адбывалася пры канкрэтных гістарычных абставінах[14].

Звернем увагу на гэтае тэрміналагічнае пытанне. У сучаснай беларускай гістарыяграфіі не існуе дакладнага вызначэння сутнасці важных гістарычных тэрмінаў, сярод якіх: з аднаго боку, ужываецца тэрмін *"нацысцкі генацыд яўрэйскага насельніцтва ў Беларусі"*, *а з другога — "Халакост"*, *"Шоа"*, *"Катастрофа"*. Пры гэтым тэрміны фактычна атаясамліваюцца. Наколькі гэта карэктна, калі мець на ўвазе гісторыю Халакосту ў Еўропе ўвогуле і нацысцкую палітыку *"знішчэння яўрэяў Беларусі"* ў гады германскай акупацыі 1941 — 1944 гг. у прыватнасці?

## Сацыяльная, паўсядзённая і культурная гісторыі Халакосту

У другой частцы сваёй справаздачы Ф.Байёр і А.Лёў распавядаюць пра даследаванне Халакосту на прыкладзе фактаў мікрагісторыі. Такі падыход на сённяя вынікае з таго, што большасць даследчыкаў раней надавала значную ўвагу паказу трагедыі яўрэяў, абсалютызуючы тыя наступствы, што былі вынікам палітыкі *"канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання"*, забяспечаным самімі ініцыятарамі генацыду яўрэяў. Патрабаваўся таксама адыход ад традыцыйнай трыяды *"злачынца — ахвяра — відавочца"*, уведзенай упершыню амерыканскім гісторыкам Р.Хільбергам. Як паказвае гісторыя, злачынныя рэжымы і іх выканаўцы не пакідалі "відавочцаў", або прыцягвалі іх да сваіх злачынстваў, або знішчалі. Усё гэта садзейнічала разгляду трагедыі еўрапейскіх яўрэяў у больш шырокіх рамках, то бок як часткі германскай акупацыі на месцах, вылучаючы асаблівасці Халакосту[15].

Аўтары адзначаюць, што сучасныя даследчыкі ўводзяць новыя тэмы на прыкладзе паказу сацыяльнай і паўсядзённай гісторыі Халакосту, а таксама гісторыі культуры. Гэтым напрамкам раней не надавалася значнай увагі. Як і наступным важным аспектам: ролі і месцу жанчын, сэксуальным адносінам, прыватным адносінам, свабоднаму часу, спорту і вопратцы, якія таксама патрабуюць увагі даследчыкаў. На думку нямецкіх аўтараў, пашырэнне тэматыкі і замацаванне новых даследчыцкіх перспектыў па вывучэнні гісторыі Халакосту неабходна, паколькі на цяперашні час толькі адзін з еўрапейскіх праектаў (European Holocaust Research Infrastructure) захоўвае на сваім інтэрнэтпартале больш за 325 тысяч фондаў у 1265 архівах з 59 краін, на апрацоўку якіх спатрэбіцца шмат гадоў.

На прыкладзе Беларусі такую працу можна бачыць у дачыненні да значнага пласта арыгінальных нямецкамоўных дакументаў, якія захоўваюцца ў фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і дзяржаўных абласных архівах, а тасама сабраныя ў асобных музеях.

У практычным плане аналіз айчынных навуковых прац, прысвечаных даследаванню паўсядзённай гісторыі Халакосту ў Беларусі, дае магчымасць вылучыць яшчэ адзін вельмі важны сюжэт не толькі паўсядзённага жыцця, але і штодзённай барацьбы вязняў гета за свае выратаванне, а таксама вядзення арганізаванай падпольнай барацьбы і супраціўлення германскім акупантам.

Нагадаем толькі некаторыя факты, якія раскрываюць характар яўрэйскага супраціўлення на беларускай зямлі. Заўважым, што ўдзельнікі кангрэса ў Мюнхене не надалі адэкватнай увагі гэтай унікальнай з'яве — гісторыі супраціўлення мясцовага яўрэйскага насельніцтва акупантам, вядомага на цяперашні час не толькі арганізацыяй уцёкаў з гета ў Глыбокім, Мінску, Навагрудку і г. д., але і стварэннем яўрэйскіх партызанскіх фарміраванняў і іх дзейнасці на акупаванай беларускай тэрыторыі. Адным з самых яскравых фактаў гераічнага супраціўлення з'яўляецца гісторыя легендарных уцёкаў 226 вязняў працоўнага лагера праз тунэль у Навагрудку ў канцы верасня 1943 г., 122 з якіх выратаваліся і апынуліся ў партызанскім атрадзе братоў Бельскіх.

Гэты быў самы шматлікі яўрэйскі партызанскі атрад (каля 1200 чалавек на момант вызвалення Беларусі) на тэрыторыі ўсёй акупаванай тэрыторыі Еўропы і адзін з першых на Навагрудчыне, створаных мясцовымі жыхарамі. Ён быў арганізаваны яўрэямі з мэтай выратавання яўрэяў. На працягу ўсяго існавання атрада яго камандзір Туўя Бельскі паслядоўна ажыццяўляў галоўную мэту — выратаваць жыццё любога яўрэя, незалежна ад узросту, полу і здольнасці ваяваць. Атрад узнік як сямейная група, і яго галоўнай мэтай на пачатковым этапе было самазахаванне. Ідэя шукаць выратаванне ў лесе з'явілася з асабістага вопыту братоў Бельскіх, якія выраслі сярод лесу ў неяўрэйскім асяроддзі. Вязні Мінскага гета, якім удалося ўцячы, папоўнілі 9 партызанскіх атрадаў і партызанскі батальён у Мінскай вобласці[16]. Апрач таго, у Глыбоцкім, Нясвіжскім, Клецкім, Капыльскім і Лахвінскім гета адбыліся паўстанні[17].

Адметнасцю вырашэння гэтай праблемы можна назваць даследаванне беларускімі гісторыкамі дзейнасці падпольнай арганізацыі Мінскага гета. На сённяя праблема з'яўляецца асабліва актуальнай, паколькі

раней гэты аспект гісторыі Мінскага гета не быў прадметам даследавання ні айчынных, ні замежных гісторыкаў. Дзякуючы працы С.Тукалы стала магчыма звярнуцца да гэтай тэмы і паказаць праблемы станаўлення і дзейнасці падпольнай арганізацыі ва ўмовах татальнага знішчэння вязняў Мінскага гета. Фарміраванне яўрэйскага падполля адбывалася на фоне пастаянных пагромаў, аблаў, расстрэлаў, голаду, хвароб, абмежавання свабоды перамяшчэння, пераследу і ганенняў з боку гестапа. Сярод задач, якія вырашалі арганізатары падполля, стаялі барацьба супраць панічных настрояў у вязняў гета, наладжванне і падтрымка кантактаў з прадстаўнікамі гарадскога патрыятычнага падполля і партызанскімі атрадамі ў ваколіцах Мінска. Са згаданай працы вынікае, што ў Мінскім гета на працягу яго існавання са жніўня 1941 па кастрычнік 1943 г. былі створаны і дзейнічалі 22 падпольныя групы, кожная з якіх складалася з дзесяці чалавек. Такія "дзясяткі" канцэнтраваліся як у самім гета, так і па-за яго межамі, па месцы работы на прадпрыемствах горада яўрэйскіх працоўных каманд. Асноўнымі кірункамі дзейнасці падпольнай арганізацыі ў Мінскім гета было распаўсюджванне сярод вязняў прапагандысцкай літаратуры, збіранне цёплага адзення, медыкаментаў, прадуктаў, зброі, боезапасаў і пераправа іх партызанам. Не менш важным накірункам з'яўлялася наладжванне сувязі з гарадскім падполлем і вывад людзей у партызанскія атрады, стварэнне ўласных партызанскіх фарміраванняў. А таксама здзяйсненне дыверсій на нямецкіх прадпрыемствах і гарадскіх камунікацыях. Як вынік, з дапамогай падпольшчыкаў Мінскага гета і яго ацалелых вязняў, пры іх непасрэдным удзеле было створана і ў значнай ступені папоўнена 9 партызанскіх атрадаў і адзін партызанскі батальён[18].

Як бачна, гэтыя факты значна пашыраюць карціну паўсядзённай гісторыі Халакосту на акупаванай тэрыторыі Беларусі, паказваюць яго асаблівасці, што праяўляліся ў арганізацыі супраціўлення як у гета, так і па-за іх межамі, увасабляліся ў дзейнасці падпольных груп і арганізацыі яўрэйскіх партызанскіх атрадаў. Такі вопыт з'яўляецца ўнікальным перш за ўсё ў кантэксце разгляду падпольнай барацьбы ў Варшаўскім і Беластоцкім гета, а таксама арганізацыі былым яўрэйскім вязнем з працоўнага лагера СС на вуліцы Шырокай у Мінску А.А.Пячэрскім практычна адзінага паспяховага паўстання ў нацысцкім канцэнтрацыйным лагеры Сабібор 14 кастрычніка 1943 г.

### Новыя тэндэнцыі і новыя крыніцы па гісторыі яўрэйскіх ганенняў

Па назіраннях нямецкіх аўтараў, у фокус новых падыходаў трапляюць асабістыя лёсы яўрэяў. Іх разгляд паказвае, што ў цэнтры асабліва вострых дыскусій знаходзяцца пытанні аб "правільных" паводзінах яўрэяў ва ўмовах ганенняў, дэпартацыі і масавых забойстваў, у першую чаргу аб дзейнасці створаных акупантамі органаў, такіх як "юдэнраты". У час дыскусіі большасць выказвалася ў тым сэнсе, што такія органы выконвалі распараджэнні акупантаў і ішлі на кааперацыю з імі дзеля таго, каб пазбавіць яўрэйскае насельніцтва самых цяжкіх наступстваў. У пасляваенны час удзельнікаў юдэнратаў абвінавачвалі ў здрадніцтве. Аўтары адзначаюць, што нават у такіх умовах для яўрэйскага насельніцтва галоўным пытаннем заставалася выжыванне любымі сродкамі.

Для яўрэяў, якія выратаваліся, важным было захаванне дакументальных звестак пра Халакост. Гэтую тэму вылучалі на кангрэсе ў якасці самастойнай, паколькі стараннямі пасляваенных пакаленняў удалося шмат што занатаваць, запісаць, задакументаваць, інтэрв'ю, у якіх распавядалася аб барацьбе за выжыванне. Такое захаванне памяці стала магчымым у розных краінах Еўропы дзякуючы не толькі навуковым выданням, але і прыцягненню да гэтай справы маладых валанцёраў. Збор падобных крыніц патрабуе іх далейшай апрацоўкі з выкарыстаннем адпаведных метадалагічных падыходаў і метадаў іх захавання.

Беларускі вопыт навуковага даследавання, педагагічнага вывучэння і практычнага захавання ўспамінаў аб трагічных падзеях пераканаўча сведчыць пра тое, што *"новыя тэндэнцыі і новыя крыніцы па гісторыі яўрэйскіх ганенняў"* не толькі актуальныя для беларускіх гісторыкаў, музейных работнікаў і супрацоўнікаў грамадскіх ініцыятыў накшталт Гістарычнай майстэрні ў Мінску, але і знайшлі практычнае ўвасабленне ў розных формах навуковых прац. У нашым выпадку размова ідзе пра функцыі такога выканаўчага органа яўрэйскіх гета, як юдэнраты. Вышэйзгаданае дысертацыйнае даследаванне С.Тукалы не абыходзіла гэтае складанае і супярэчлівае пытанне. Пад час абароны менавіта названыя пытанні выклікалі значную ўвагу апанентаў і грамадскасці. Так, у сваёй працы ён прыходзіць да вельмі важнай высновы пра тое, што *"юдэнрат як выканаўчы орган, створаны нямецкімі ўладамі ў выніку першапачатковай рэалізацыі нацысцкай палітыкі знішчэння яўрэяў Мінска, не стаў марыянеткай акупантаў"*[19]. Ён сцвярджае, што юдэнрат стварыў магчымасць згуртаваць вакол сябе пэўную частку насельнікаў гета дзеля частковага паляпшэння ўмоў іх існавання, атрымаў, няхай невялікую, але адчувальную падтрымку з боку падпольшчыкаў і партызанаў[20].

### Візуальная гісторыя

Доўгі час даследчыкі Халакосту цікавіліся найперш дакументальнымі крыніцамі, якія з'яўляліся асновай для комплекснага паказу гісторыі генацыду. У той жа час фотадакументы доўгі час заставаліся без належнай увагі ці выкарыстоўваліся выключна ў ілюстрацыйных мэтах. На кангрэсе гэтае пытанне было ў фокусе выступаў дакладчыкаў, якія раскрывалі гістарычныя праблемы, выкарыстоўваючы для гэтага фотаальбомы забойцаў: напрыклад, фотаальбом былога намесніка каменданта лагера смерці Сабібор. На

кангрэсе дэманстраваліся візуальныя крыніцы, датычныя лагера смерці ў Асвенцыме. У ходзе абмеркавання даследчыкі прыйшлі да важнай высновы, што такія крыніцы значна паглыбляюць веды па асобных аспектах гісторыі Халакосту, часам больш, чым традыцыйныя дакументы. Візуальныя крыніцы з'яўляюцца не столькі матэрыялам для ілюстрацыі падзей, колькі крыніцай для рэканструкцыі малавядомых старонак гісторыі знішчэння яўрэяў[21].

Беларускія даследчыкі маюць даволі абмежаваныя магчымасці для выкарыстання візуальных крыніц. Аднак апошнім часам яны пашыраліся дзякуючы выкарыстанню новых інфармацыйных платформ, створаных у музеях ці майстэрнях. Добрым прыкладам з'яўляецца дзейнасць Гістарычнай майстэрні ў Мінску, дзе ў апошнія гады вядзецца грунтоўная праца па выяўленні і захаванні самых розных матэрыялаў, у тым ліку візуальных дакументаў, датычных акупацыі Мінска, трагедыі мірнага насельніцтва, вязняў мінскага гета ці шталага 352 для савецкіх ваеннапалонных.

Надзвычай важную навуковую каштоўнасць для беларускіх гісторыкаў, якія займаюцца даследаваннем гісторыі лагера смерці каля вёсак Вялікі і Малы Трасцянец, мае адзін візуальны дакумент з фондаў Зямельнага архіва ў Кобленцы, дзе захоўваюцца дакументы аб судовым працэсе над былым начальнікам крымінальнай службы мінскай паліцыі бяспекі і СД Г.Хойзерам, які з вясны 1942 па восень 1943 г. узначальваў аддзел па барацьбе з сабатажам, шпіянажам і ліквідацыі яўрэяў у Мінску. Гэта схема размяшчэння аб'ектаў на тэрыторыі працоўнага лагера Малы Трасцянец, ім уласнаручна складзеная пад час судовага працэсу.

### Палітычныя і адукацыйныя патрабаванні

На кангрэсе была звернута ўвага таксама на неабходнасць улічваць пэўныя палітычныя моманты, звязаныя з правядзеннем даследаванняў па гісторыі Халакосту ў розных еўрапейскіх краінах. Розныя праявы негатыву да гэтай тэмы, якую часам разглядаюць у кантэксце расізму, антысемітызму, ксенафобіі. Часам узнікаюць сітуацыі, калі ў асобных краінах пытанні калабарацыі адсоўваюцца на задні план. Таму на парадку дня стаяць задачы па правядзенні ўзважаных і крытычных даследаванняў.

Значная ўвага надавалася выкарыстанню ведаў аб Халакосце ў педагагічным працэсе, правядзенню кампаратыўных даследаванняў, узмацненню выкарыстання міжнароднага вопыту. Сам кангрэс засведчыў тое, што новая інфармацыя ў вывучэнні гэтай тэмы можа стаць штуршком для паўсюднага правядзення даследаванняў па гісторыі Халакосту.

На кангрэсе прагучаў даклад вядучага спецыяліста Інстытута найноўшай гісторыі ў Мюнхене доктара Ю. фон Зааль на тэму "Памяць пра Халакост без яўрэяў: на прыкладзе Мемарыяльнага комплексу "Малы Трасцянец у Беларусі", якая звярнула ўвагу ўдзельнікаў сустрэчы на ўплыў палітычнага ці дзяржаўнага фактараў на прыняцце адэкватных рашэнняў у дачыненні да гістарычных падзей мінулага і іх сучаснай ацэнкі. Яна адзначыла, што пасля адкрыцця экскурсійных аб'ектаў першай і другой будаўнічых чэргаў Мемарыяльнага комплексу "Трасцянец" у 2015 і 2018 гг. доўга шукала сляды гістарычнай памяці аб яўрэях Мінска і дэпартаваных яўрэях з Еўропы, аднак не здолела гэта зрабіць з-за таго, што на інфармацыйных шыльдах адсутнічае тэрмін "яўрэй". Знайсці такую згадку ёй удалося толькі на помніку ва ўрочышчы Благаўшчына, якім завяршаўся экскурсійны маршрут па лагеры смерці Трасцянец. Пад час выступлення ў Мюнхене доктар ставіла не менш важнае пытанне аб культуры памяці ў Беларусі, дзе яшчэ захоўваюцца рэшткі савецкіх традыцый абагульнення ці нівеліроўкі розных катэгорый ахвяр, не надаецца ўвага новаму міжнароднаму фактару захавання імяннай памяці кожнага забітага ў Трасцянцы. Больш за тое, праблему для экскурсантаў стварае факт устаноўкі аўстрыйскім бокам вясной 2019 г. новага помніка пад назвай "Масіў імёнаў", дзе пазначаны імёны 13 500 аўстрыйскіх яўрэяў, якія сталі ахвярамі нацысцкай палітыкі пераследу ў Мінскім гета і ў лагеры смерці Трасцянец.

У сувязі з гэтым узнікаюць прынцыповыя пытанні з пункта гледжання педагагічных падыходаў да экскурсійнай працы на розных аб'ектах Мемарыяльнага комплексу "Трасцянец". На думку нямецкай даследчыцы К.Янеке, якая была ўдзельніцай XVIII Міжнароднай навуковай канферэнцыі ў Мінску 5 красавіка 2019 г., у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі да музеефікацыі ваеннага мінулага на тэрыторыі цяперашняга мемарыялу ў раёне вёсак Вялікі і Малы Трасцянец створаны не мемарыял, а "мемарыяльны ландшафт", на якім на цяперашні час сабраны розныя формы і практыкі, якія часам супярэчаць адэкватнаму ўшанаванню трагічнага мінулага і выклікаюць у наведвальнікаў шэраг пытанняў, адказы на якія ім даводзіцца шукаць самім, а не ў спецыяльна створаным для гэтага інфармацыйным цэнтры мемарыяла. Пры гэтым, як адзначае даследчыца, адказным за арганізацыю і правядзенне экскурсій і педагагічнай працы выступае Беларускі культурны цэнтр духоўнага Адраджэння, які знаходзіцца ў падпарадкаванні Беларускай праваслаўнай царквы, а не адпаведнай дзяржаўнай інстытуцыі.

Такая заклапочанасць нямецкіх гісторыкаў і музеязнаўцаў не можа заставацца без увагі не толькі беларускіх даследчыкаў, шырокай грамадскасці, але і адказных за правядзенне на дзяржаўным узроўні маштабнай інфармацыйнай, экскурсійнай і педагагічнай працы. У гэтым моры рознай інфармацыі, друкаванай прадукцыі і даследчыцкіх наратываў сучаснік не мае магчымасці самастойна разабрацца не толькі з гісторыяй Халакосту на ўсёй еўрапейскай прасторы, але ў першую чаргу на акупаванай тэрыторыі Беларусі.

Таму перад беларускай грамадскасцю паўстае шэраг важных задач, якія патрабуюць неадкладнага вырашэння з удзелам адпаведных дзяржаўных, навуковых, педагагічных устаноў. Па-першае, актуальнай застаецца задача па завяршэнні будаўнічых і выкананні архітэктурных прац на ўжо дзеючых аб'ектах першай і другой чэргаў будаўніцтва Мемарыяльнага комплексу "Трасцянец". Па-другое, тэрміновае адкрыццё спецыяльнага інфармацыйнага цэнтра мемарыяла для правядзення педагагічнай працы з рознымі катэгорыямі наведвальнікаў. Па-трэцяе, арганізацыя цэнтралізаванай падрыхтоўкі экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў для правядзення экскурсій, што будуць адпавядаць міжнародным патрабаванням.

[1] Bajohr F., Löw A. Europa und der Holocaust. Forschungstrend auf dem Kongress Lessons & Legacies 2019 in München // Vierteljahrshefte für Zeitgeschichte. 2020. Nr. 2. S. 319.

[2] Там жа. S. 320.

[3] Там жа. S. 321.

[4] Здановіч У.В. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941—1945 гг.) у адлюстраванні айчыннай гістарыяграфіі: аўтарэф. дыс. ...докт. гіст. навук: 00.07.09. Мінск, 2016. С. 21.

[5] Здановіч У.В. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941—1944 гг.) у адлюстраванні айчыннай гістарыяграфіі: манаграфія. Брэст, 2008. С. 173.

[6] Винница Г.Р. Нацистская политика геноцида еврейского населения в восточной и центральной частях Беларуси в 1941—1944 гг.: автореф. ...дис. канд. ист. наук: 07.00.02 Минск, 2008; Вінніца Г.Р. Халакост у Оршы 1941—1944 гг. // Весн. Беларус. дзярж. пед. ун-та імя М.Танка. Сер. 2. 2006. № 2. С. 31—34; Вінніца Г.Р. Халакост у Слуцкім раёне // Весці Беларус. дзярж. пед. ун-та імя М. Танка. Сер. 2. 2006. № 2. С. 13—17; Корсак А.І. Генацыд яўрэйскага насельніцтва на тэрыторыі Віцебскай вобласці, 1941—1943: аўтарэф. ...канд. гіст. навук: 00.07.02. Мінск, 2008; Корсак А.І. Знішчэнне яўрэйскага насельніцтва на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў 1941—1943 гг. // Вестн. Полоцк. гос. ун-та. Сер. А. Гуманит. науки. 2010. № 1. С. 73—78; Розенблат Е.С. Нацистская политика геноцида в отношении еврейского населения в Западных областях Беларуси (1941—1944): автореф. дис. ...канд. ист. наук: 07.00.02. Минск, 2000; Розенблат Е.С., Еленская И. Э. Пинские евреи. 1939—1944 гг. Брест, 1997.

[7] Розенблат Е.С. Юденраты в Беларуси: проблема коллаборации // Уроки Холокоста: история и современность: сб. науч. работ. Минск, 2009. Вып. 1. С. 65—68; Савоняко М.Я. Немецко-фашистские лагеря на территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны: автореф. ...дис. канд. ист. наук: 07.00.02. Минск, 1993; Тукала С.М. Дэпартацыя яўрэяў краін Заходняй Еўропы ў Мінскае гета ў гады Вялікай Айчыннай вайны // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 3. 2007. № 1. С. 26—30; Тукала С.М. Ліквідацыя Мінскага гета: асаблівасці, этапы і наступствы // Весн. Брэсц. дзярж. ун-та імя А.С.Пушкіна. Сер. гуманіт. і грамад. навук. 2007. № 3. С. 50—55; Тукала С.М. Генацыд і барацьба яўрэяў Мінскага гета ў гады Вялікай Айчыннай вайны (ліпень 1941 — кастрычнік 1943 года): аўтарэф. ...канд. гіст. навук: 00.07.02. Мінск, 2008; Иоффе Э.Г. Белорусские евреи: трагедия и героизм: 1941—1945. Минск, 2003; Иоффе Э.Г. Страницы истории евреев Беларуси: краткий науч-популяр. Очерк. Минск, 1996; Иоффе Э.Г. Белорусские евреи: трагедия и героизм: 1941—1945. Минск, 2003; Иоффе Э.Г. Холокост на белорусской земле: по источникам, издан. в Беларуси // Беларус. археаграф. штогод. 2001. Вып. 2. С. 159—168; Иоффе Э.Г. Иностранные евреи в Тростенецком лагере смерти. Минск, 2000.

[8] Трагедия евреев Белоруссии в 1941—1944 гг.: сб. материалов и документов. Минск, 1995; Холокост в Беларуси. 1941—1944: док. и материалы. Минск, 2002; Лагерь смерти Тростенец. Документы и материалы. Минск, 2003; Тростенец / Сост. С.В.Жумарь, Ч.А.Черноглазова. Минск, 2003; Актуальные вопросы изучения Холокоста на территории Беларуси в годы немецко-фашистской оккупации. Сборник научных работ. Минск, 2005; Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941—1945. Минск, 2005; Праведники народов мира Беларуси: живые свидельства Беларуси. Минск, 2009; Свидетельствуют палачи: уничтожение евреев на оккупированной территории Беларуси в 1941—1944 гг.: документы и материалы. Минск, 2009; Уроки Холокоста: история и современность. Сборник научных трудов. Вып. 3. Минск, 2010; Тростенец: трагедия народов Европы, память в Беларуси: документы и материалы. Минск, 2016.

[9] Янеке К. Официальные германо-белорусские отношения 1990—2019 гг. в зеркале развития места памяти "Тростенец" // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 5 крас. 2019 г. Вып. 18. Мінск, 2020. С. 11; Gerlach Ch. Der Mord an den europäischen Juden. Ursachen, Ereignisse, Dimensionen. München, 2017.

[10] Альтман И.А. Холокост // Холокост на территории СССР: Энциклопедия. Москва, 2009. С. 1035.

[11] Там жа.

[12] Gerlach Ch. Der Mord an den europäischen Juden. Ursachen, Ereignisse, Dimensionen.

[13] Hilberg R. The Destruction of the European Jews [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: https://en.wikipedia.org/wiki/Raul_Hilberg. Дата доступу: 28.04.2020.

[14] Gerlach Ch. Der Mord an den europäischen Juden. Ursachen, Ereignisse, Dimensionen. S. 26.

[15] Bajohr F., Löw A. Europa und der Holocaust. Forschungstrend auf dem Kongress Lessons & Legacies 2019 in München. S. 322.

[16] Тукала С.М. Генацыд і барацьба яўрэяў Мінскага гета ў гады Вялікай Айчыннай вайны (ліпень 1941 — кастрычнік 1943 года): аўтарэф. ...канд. гіст. навук: 00.07.02. С. 15.

[17] Иоффе Э.Г. Белорусские евреи: трагедия и героизм: 1941—1945. Минск, 2003. С. 138.

[18] Тукала С.М. Генацыд і барацьба яўрэяў Мінскага гета ў гады Вялікай Айчыннай вайны (ліпень 1941 — кастрычнік 1943 года): аўтарэф. ...канд. гіст. навук: 00.07.02. С. 15.

[19] Там жа. С. 14.

[20] Там жа.

[21] Bajohr F., Löw A. Europa und der Holocaust. Forschungstrend auf dem Kongress Lessons & Legacies 2019 in München. S. 324—325.